АКЦИЯ

# «БЕЛАРУСКАЯ - МАЯ МОВА»

***Магчыма, гэта і не нова, што слова — зерне на сяўбе, а хто не любіць роднай мовы, той любіць толькі сам сябе...***

С. Грахоўскі

Сёння ў свеце шмат чудесных моў. Адны з іх вабяць сваей прыгажосцю і непаўторнасцю, другія — мілагучнасцю. Але ў кожнага чалавека ёсцьтолькі адна родная мова. Менавіта на гэтай мове ён размаўляе з роднымі, сябрамі, знаёмымі. Родная мова шмат не патрабуе. Але калі ўжо назваў яе роднай, калі лічыш яе такой для сябе, павінен жа быць перад ёй хоць нейкі абавязак. Хоць адзін дзень. Калі будзе яе афіцыйнае міжнароднае свята, 21 лютага (Дзень роднай мовы).



## *РАЗМАУЛЯИ ПА-БЕЛАРУСКУ*

Менавіта з мэтай абуджэння цікавасці і любові да роднай мовы і літаратуры, бібліятэкамі раёна арганізуюцца шматлікія мерапрыемствы па папулярызацыі беларускай кнігі, роднай мовы. У гэтым годзе мы чарговы раз запрашаем жыхароў горада прыняць удзел у акцыі, якая будзе праходзіць у цэнтральнай бібліятэцы імя А.С.Пушкіна ў рамках дэкады беларускай і краязнаўчай літаратуры "Мову родную, край свой любіце!". Калі вы адкажаце на нашы пытанні правільна, то атры- маеце прыз: разавы купон на выкананне платнай паслугі без аплаты і магчымасць ганарыц- ца, што добра ведаеце бела- рускую мову.

Далучайцеся да нас! Давайце паспрабуем пачаць кожны з сябе: зранку сказаць сваім блізкім "добрай раніцы", "калі ласка", калегам — "прывітанне", "прабачцё", сябрам — "дзякуй", "да пабачэння". Пачнём дзень з гэтых родных слоў, станем бліжэй адзін да аднаго, адчуем сябе сапраўднымі беларусамі.

*Запрашаем усіх мазыран прыняць удзел у акцыі "Беларуская — мая мова!" 24 лютага з 10.00 да 18.00 у ЦБ імя А.С.Пушкіна* ***(вул. Пралетарская, 82).***

**Таццяна СУДАС,**
**бібліёграф І катэгорыі**
**сектара інфармацыі**
**цэнтральнай бібліятэкі**
**імя А.С.Пушкіна**

Судас, Т. “Беларуская - мая мова” : [анонс акцыі ў цэнтральнай бібліятэцы] / Таццяна Судас // Жыццё Палесся. - 2016. - 20 февраля. - С. 12.